**Котава, Н.** Боль Афганістана / Н. Котава // Камуністычны шлях (Расонскі р-н). — 1990. — 22 лют. — С. 2.

## БОЛЬ АФГАНІСТАНА

Прывычнай ужо з'явай на розных урачыстасцях стала ўшаноўванне перадавікоў вытворчасці, ветэранаў вайны і працы. А вось бачыць уручэнне баявой узнагароды ў наш мірны час даводзіцца нячаста.

Як паведамлялася ў раённай газеце, 24 студзеня кандыдат у народныя дэпутаты БССР генерал-палкоўнік В. Р. Самойленка на сустрэчы з выбаршчыкамі ў раённым Доме культуры ўручыў медаль «За адвагу» нашаму земляку былому воіну-інтэрнацыяналісту Аляксандру Рубашэнку.

У Афганістан Аляксандр трапіў не па волі лёсу. Гэты баявы шлях выбраў сам, свядома. Ведаў аб жахлівай вайне з душманамі не па газетах і тэлебачанні, а па расказах, успамінах камандзіраў – удзельнікаў гэтай вайны, якія рыхтавалі навабранцаў у вучэбным цэнтры непадалёк ад Тэрмеза. Добра развітаму фізічна, дысцыплінаванаму салдату прапаноўвалі застацца тут, у цэнтры. Але, напэўна, не ў яго характары было шукаць лёгкага жыцця. І невыпадкова.

Вось як адзываецца аб Аляксандры былая настаўніца Расонскай сярэдняй школы імя П. М. Машэрава, дзе ён заканчваў 8 класаў, заслужаная настаўніца БССР, выдатнік народнай асветы Н. Т. Прыбыткіна:

– Сашу памятаю добра. Здаралася, праяўляў ён нястрыманасць у адносінах да некаторых настаўнікаў, нават агрэсіўныя паводзіны. Але, на маю думку, таму, што быў чалавекам з абвостраным пачуццём справядлівасці. Ён «бунтаваў» супраць малейшага падхалімства, ілжы, несправядлівасці. Сам жа ніколі не хаваўся за спіны таварышаў і ў душы быў вельмі добрым.

Мажа гэтыя рысы характару, падмечаныя педагогам, і абумовілі яго выбар.

Воінскую службу Аляксандр праходзіў на вартавой заставе непадалёк ад Кандагара. Блізкасць пакістанскай граніцы, праз якую ў Афганістан перапраўляліся зброя, спецыяльна падрыхтаваныя атрады апазіцыі, рабіла асабліва складаным жыццё нашых воінаў. Аляксандр быў вадзіцелем-механікам БТР. Разам з баявымі сябрамі суправаджаў калоны аўтамашын з грузамі для савецкіх войск і мірнага насельніцтва Афганістана, блакіраваў найбольш небяспечныя ўчасткі дарог, вёў баявыя дзеянні супраць варожых групіровак. Аднак расказваць аб гэтым не любіць. Балюча, напэўна, вярэдзіць успаміны аб загінуўшых таварышах, аб бесчалавечнай і крывавай бойні.

– Разумееце, – гаворыць Аляксандр, – самае цяжкае было не складаныя ландшафтна-кліматычныя ўмовы, не фізічныя нагрузкі. Самае страшнае – гэта боль душы, калі хаваеш сяброў, калі бачыш мукі параненых таварышаў і разам з тым разумееш, што ты сам нясеш таксама смерць. Няхай ім, душманам, але ўсё роўна людзям.

Афганістан навучыў многаму: і сапраўднай дружбе, і ўзаемавыручцы, і цвёрдасці. Але многае і забраў. Я не кажу пра здароўе. У маім выпадку гэта не самае галоўнае. Паранены быў толькі аднойчы і лёгка. Два гады вайны наклалі свой адбітак на характар, светапогляд.

Маральнай траўмай стала паведамленне ўрада аб тым, што наша вайна – гэта памылка палітыкаў.

–Даведаліся мы аб гэтым на сваёй жа заставе з перадачы па тэлебачанні. Уявіце сябе на нашым месцы. Яшчэ ўчора мы ішлі ў бой са святой верай у сваю правату, гінулі героямі. А сёння, аказваецца, мы – проста марыянеткі.

Усё гэта, напэўна, і паслужыла таму, што сярод нас, «афганцаў», здараюцца выпадкі праяўлення жорсткасці, іншы раз цынізму, нястрыманасці. Душэўная неўраўнаважанасць, я адчуваю па сабе, з гадамі праходзіць. Час лечыць раны. Дапамагае ў жыцці дружба з тымі, з кім ваяваў.

– Два гады вайны ў адным экіпажы плячо ў плячо прайшоў з наводчыкам, ураджэнцам г. Міёры. Мы з ім аднолькавыя ўзнагароды маем. Да медалёў «За адвагу», які я атрымаў 24 студзеня, былі прадстаўлены ў лютым 1988 года за тое, што вывезлі параненых у час артабстрэлу з суседняй заставы. Да другой такой жа ўзнагароды былі прадстаўлены пазней за паспяховы вывад войск. У тым, што рота выйшла на Радзіму без страт, я лічу, вялікая заслуга наводчыка. Мая задача заключалася ў тым, каб машына працавала без збояў, не спынілася, не стрымала рух калоны.

– А як сустрэла Радзіма? – пытаюся.

– Адчуванне бяспекі і мірнай цішыні немагчыма перадаць словамі. Было ўсё: і слёзы, і радасць, і смутак. Той урачыстай сустрэчы, якая была арганізавана для першых воінскіх часцей, не было. Але гэта не засмучала. У хуткім часе скончыўся тэрмін службы. Пытання, куды пайсці працаваць, перада мной не стаяла. Да арміі я закончыў Гарадоцкае СПТВ-174 і працаваў трактарыстам у МПМК-63. У гэты ж працоўны калектыў і вярнуўся, працую па спецыяльнасці. Ажаніўся, па льготнай чарзе атрымаў кватэру.

Загадчык аўтагаспадаркі В. А. Лукашонак, сакратар партарганізацыі, дзе працуе Аляксандр, Н.Д. Сяльчонак адзначалі, што ён па характару таварыскі, надзейны, заўсёды дапаможа таварышу. Але вельмі блізка ўспрымае нават дробязную несправядлівасць і не можа стрымацца, каб не ўступіць у канфлікт.

– Мы некалькі па-рознаму глядзім на жыццё. – разважае  Аляксандр. – Там не было паняцця маленькай або вялікай несправядлівасці.Усе рэчы называліся сваімі імёнамі. У гэтым жыцці складаней. І праўда, і хлусня іншы раз побач. Бачыць гэта бывае невыносна.

– Крыху больш года прайшло з таго часу, калі апошні савецкі салдат пакінуў Афганістан. Вайна скончылася. Яе ўдзельнікі прыроўнены да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Але гэта толькі фармальна. Адчуваюць сябе «афганцы» зусім не так, як героі другой сусветнай. Акрамя цяжкіх уражанняў, якія пакінула вайна ў іх сэрцах, на плечы «афганцаў» лягло ўсведамленне яе памылковасці, непатрэбнасці. І мы, землякі, знаёмыя, таварышы, павінны разумець гэта і старацца зрабіць усё магчыпмае, каб аблегчыць жахі перажытага імі, дапамагчы знайсці сябе ў жыцці, адагрэць іх душы, раздзяліць пакуты.

**Н. Котава**